Цана 10 кап. (грош.)

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Орган Часовых Упраўленняў Віленскай області і горада Вільна

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 19
12 кастрычніка 1939 г.
Чацвер

Совецка-літоўскі дагавор

Совецкая палітыка міра, добрасуседскія адносіны і дружба народаў атрымлівае ўсё новыя поспехі. У Маскве 10 кастрычніка падпісан дагавор аб перадачы Літоўскай рэспубліцы горада Вільна і Віленскай обласці і аб узаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам і Літвой.

Гэтым дагаворам з Літвой, як і заключанымі раней дагаворамі з Эстоніяй і Латвіяй, Совецкі Саюз забяспечвае беспаснасць сваіх граніц і ўмацоўвае яшчэ больш сваю абарону.

Совецкі Саюз устраняе пагрозу, існаваўшую для слаба абароненых суседніх з СССР дзяржаў з боку імперыялістычных дзяржаў. Так складваецца жалезны пояс Совецкай абароны на ўсёй Прыбалтыцы, так ствараецца трывалы мір на Усходзе Еўропы.

Народы нашай радзімы з велізарнейшым задавальненнем сустрэнуць заключэнне новага дагавора, умацоўваючага магутнасць Совецкага Саюза, ствараючага новы бар'ер перад усякімі імперыялістычнымі прошукамі. Народы Совецкага Саюза вітаюць мудрую палітыку свайго ўрада, які сумеў сістэмамі дагавораў з суседнімі дзяржавамі захаваць недатыкальнасць і спакой Совецкай краіны.

Ва ўмовах еўрапейскай вайны палітыка міра цвёрда, няўхільна і паслядоўна выводзіць з ваеннай лініі, абняўшы адну за другой, невялікія дзяржавы, якія не змаглі-б захаваць уласнымі сіламі сваю недатыкальнасць і незалежнасць, беспаснасць і мірную працу свайго насельніцтва. Заключэнне Совецка-Літоўскага дагавора у асабліваснці знамянацельна. Дагавор з'яўляецца новым і важнейшым звяном ў той палітыцы ўмацавання Совецка-Літоўскіх дружаственных сувязей, якую Совецкі Ўрад праводзіў на працягу амаль 20 год. У дагаворы паміж СССР і Літвой з найбольшай поўнатой выражан прынцып узаемнай дапамогі двух дружаственых дзяржаў, прынцып сумеснай абароны дзяржаўных граніц Літвы.

Літоўская дзяржава ўзнікла ў няўстойлівай абстаноўцы Версальскага перадзела света. Буйныя імперыялістычныя дзяржавы кроілі Еўропу па свайму праізволу. Літоўскі народ з трудом адстайваў сваю незалежнасць у няроўнай барацьбе з польскімі захватчыкамі і іх пакравіцелямі. Совецкі Ўрад у 1920 годзе першым прызнаў Літоўскую Рэспубліку, працягнуў ёй руку дапамогі. У след за Совецкім Урадам Літву прызналі і іншыя дзяржавы.

Польская ваеншчына ў 1920 годзе азбойнічым спосабам захапіла Вільна, старажытную сталіцу літоўскага народа. Імперыялістычныя краіны благаславілі гэты паступак, толькі Совецкі Ўрад не прызнаваў ніколі, што Вільна стала польскім горадам.

Совецкі народ са спачуваннем адносіўся да барацьбы літоўскага народа з польскімі панамі за сваю незалежнасць. У радзе дагавораў былі замацаваны дружаскія адносіны паміж СССР і Літвой. У 1926 годзе быў заключан дагавор аб ненападзе У 1934 годзе ён быў прадоўжан.

Распад нежыццяздольнай польскай дзяржавы стварыў новае становішча. Доблесная Чырвоная Армія вызваліла народы, знаходзіўшыяся пад ярмом польскіх драпежнікаў-імперыялістаў, вызваліла ўкраінцаў і беларусаў. Чырвоная Армія прынесла таксама свабоду гораду Вільну, які амаль 20 год назад быў захоплен польскімі генераламі.

СССР і Літва сталі непасрэднымі суседзямі. Паміж імі ўстанаўліваецца дзяржаўная граніца. Разам з новым становішчам паяўляюцца новыя задачы абароны нашай краіны. Выходзячы з старай дружбы, умацоўваючы яе новымі сувязямі, СССР і Літва вырашылі ўноў узнікшыя пытанні на началах узаемнай дапамогі, у поўнай суадпаведнасці з інтарэсамі абедзьвух дзяржаў, у інтарэсах іх абароны. Умацоўваючы саўмеснымі ўзброенымі сіламі граніцы Літвы, Совецкі Саюз гэтым самым узмацняе абарону Совецкіх граніц.

Прынцып узаемнай дапамогі найбольш поўна выражаецца ў дагаворы паміж Совецкім Саюзам і Літвой.

„Совецкі Саюз і Літоўская Рэспубліка абавязваюцца сумесна ажыццяўляць абарону дзяржаўных граніц Літвы, для чаго Совецкаму Саюзу прадастаўляецца права трымаць ва ўстаноўленых па ўзаемнаму пагадненню пунктах Літоўскай Рэспублікі за свой кошт строга абмежаваную колькасць совецкіх наземных і паветраных узброеных сіл".

Совецкі Саюз аказвае дапамогу Літве ўзбраеннем і іншымі ваеннымі матэрыяламі.

Горад Вільна і Віленская вобласць перадаецца Совецкім Саюзам Літоўскай Рэспубліцы. Устанаўліваецца граніца паміж СССР і Літвой. Абедзве дзяржавы дапамагаюць адна другой у выпадку нападу або пагрозы нападу на Літву або праз Літву на Совецкі Саюз.

СССР і Літва дагаварваюцца і прымаюць па ўзаемнаму пагадненню меры, неабходныя для абароны абедзьвух дзяржаў у выпадку нападу.

СССР і Літва не заключаюць якіх-небудзь саюзаў і не ўдзельнічаюць у коаліцыях, накіраваных супроць адной з дагаварваючыхся старон.

Дагавор ні ў якой меры не закранае суверэнных праў абедзьвух дзяржаў, дзяржаўнага ўстройства і эканамічнай і соцыяльнай сістэмы. СССР і Літва не ўмешваюцца ва ўнутраныя справы друг друга.

Такі кароткі змест дагавора, упісваючага новую старонку ў гісторыю дружаственых адносін СССР і Літвы. Прынцып узаемнай дапамогі чырвонай ніткай праходзіць праз яго тэкст. Мы атрымліваем новы сродак для абароны нашай дзяржавы. Літоўскі народ атрымлівае задавальненне сваіх карэнных нацыянальных інтарэсаў. Няхай вучацца народы света гэтай совецкай палітыкі дружбы і згоды з суседнімі дзяржавамі.

Чаму Совецкаму Ураду ўдаецца мірным, натуральным шляхам вырашаць пытанні знешняй палітыкі, якія ў старой і ў новай гісторыі багата паліты крывёй народаў? Чаму імперыялістычныя краіны імкнуцца рашыць гэтыя пытанні ў бессэнсоўных войнах і ўсё-ж не вырашаюць, а прадстаўлялі і прадстаўляюць пагрозу чалавецтву, яго развіццю, яго культуры? Адказ зусім просты — знешняя палітыка краіны соцыялізма ёсць палітыка міра, ёсць палітыка ўстанаўлення добрасуседскіх адносін з усімі дзяржавамі. Дружба народаў ляжыць у аснове Ленінска-Сталінскай палітыкі ўрада СССР.

Праводзячы адкрытую, цвёрдую, мудрую палітыку свайго ўрада, Совецкі Саюз дае ўсім дзяржавам прыклад мірнага вырашэння скаданейшых пытанняў знешняй палітыкі, указвае шляхі ўстанаўлення і ўмацавання дружаственых адносін паміж усімі краінамі.

(Перадавая газеты „Правда" за 11 кастрычніка 1939 г.).

ДА ЗАКЛЮЧЭННЯ ДАГАВОРА

аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільна і Віленскай обласці і аб узаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам і Літвой

На працягу 3—10 кастрычніка ў Маскве адбываліся перагаворы паміж Народным Камісарам Замежных Спраў тав. Молатавым і Міністрам Замежных Спраў Літвы п. Урбшыс па пытанню аб заключэнні дагавора аб передачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільна і Віленскай обласці і аб узаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам і Літвой.

У перагаворах удзельнічалі: тт. Сталін, Пацёмкін і паверены ў справах СССР у Літве тав. Пазднякоў, а са стараны Літвы — Намеснік Старшыні Совета Міністраў Літвы Бізаўскас, Камандуючы літоўскай арміяй генерал Рашкіціс і літоўскі пасланік у Маскве п. Наткевічус.

Перагаворы закончыліся падпісаннем 10 кастрычніка дагавора аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільна і Віленскай обласці і аб узаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам і Літвой.

ДАГАВОР

аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільна і Віленскай обласці і аб узаемадапомазе паміж Совецкім Саюзам і Літвой

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР з аднаго боку і Прэзідэнт Літоўскай Рэспублікі з другога, у мэтах развіцця ўстаноўленых мірным дагаворам ад 12 ліпеня 1920 года дружэственных адносін, аснованых на прызнанні незалежнай дзяржаўнасці і неўмяшання ва ўнутраныя справы другой стараны;

прызнаючы, што мірны дагавор аб ненападзе і мірным вырашэнні канфліктаў ад 28 верасня 1926 года па ранейшаму з'яўляецца моцнай асновай іх узаемных адносін і абавязацельстваў;

пераканаными, што інтарэсам абодвух дагаварваючыхся старон адпавядае вызначэнне дакладных умоў, забеспячэнне ўзаемнай беспаснасці і справядлівае вырашэнне пытання аб дзяржаўнай прыналежнасці горада Вільна і Віленскай обласці, незаконна адторгнутых Польшчай ад Літвы, прызналі неабходным заключыць паміж сабой ніжэй наступны дагавор аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільна і Віленскай обласці і аб узаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам і Літвой і назначылі для гэтай мэты сва'мі упаўнаважаным —

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР:

В. М. Молатава, Старшыню Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў.

Прэзідэнт Літоўскай Рэспублікі:

Юзаса Урбшыс, Міністра Замежных Спраў, —

якія упаўнамачываюцца па ўзаемным прад'яўленні сваіх паўнамоцтваў, знойдзеных складзеннымі ў належнай форме і належным парадку, згадзіліся аб ніжэй наступным:

Артыкул 1

У мэтах замацавання дружбы паміж СССР і Літвой горад Вільна і Віленская обласць перадаюцца Совецкім Саюзам Літоўскай Рэспубліцы з уключэннем іх у састаў дзяржаўнай тэрыторыі Літвы і ўстанаўленнем граніцы паміж СССР і Літоўскай Рэспублікай згодна прыкладзеннай карты. Пры чым больш падрабязна гэта граніца будзе апісана ў дадатковым пратаколе.

Артыкул 2.

Совецкі Саюз і Літоўская Рэспубліка абавязваюцца аказваць адзін другому ўсялякую дапамогу ў тым ліку і ваенную ў выпадку нападу або пагрозы нападу на Літву, а таксама ў выпадку нападу або пагрозы нападу праз тэрыторыю Літвы на Совецкі Саюз з боку любой еўрапейскай дзяржавы.

Артыкул 3.

Совецкі Саюз абавязваецца аказваць Літоўскай арміі дапамогу на льготных умовах узбраеннем і іншымі ваеннымі матэрыяламі.

Артыкул 4.

Совецкі Саюз і Літоўская Рэспубліка абавязваюцца сумесна ажыццяўляць абарону дзяржаўных граніц Літвы, для чаго Совецкаму Саюзу прадстаўляецца права трымаць ва ўстаноўленых па ўзаемнаму пагадненню пунктах Літоўскай Рэспублікі за свой кошт строга абмежаваную колькасць совецкіх наземных і паветраных узброеных сіл. Дакладнае местапрабыванне гэтых войск і граніцы, у якіх яны могуць быць размешчаны, іх колькасць у кожным асобным пункце, а таксама ўсе іншыя пытанні, як-та: гаспадарчага, адміністрацыйнага, юрысдыкцыйнага характару і іншыя, узнікаючыя ў сувязі з прабываннем Совецкіх узброеных сіл на тэрыторыі Літвы, згодна гэтага дагавора будуць рэгуліравацца асобнымі пагадненнямі.

Неабходныя для гэтай мэты ўчасткі і пабудовы будуць адводзіцца Літоўскім Урадам на правах арэнды па сходнай цане.

Артыкул 5.

У выпадку пагрозы нападу на Літву або на СССР праз тэрыторыю Літвы абедзве Дагаварваючыяся Стараны неадкладна абмяркуюць стварыўшаеся становішча і прымуць усе меры, якія будуць па ўзаемнаму пагадненню прызнаны неабходнымі для забеспячэння недатыкальнасці тэрыторыі Дагаварваючыхся Старон.

Артыкул 6.

Абедзве Дагаварваючыяся Стараны абавязваюцца не заключаць якіх-небудзь саюзаў, або ўдзельнічаць у кааліцыях, накіраваных супроць адной з Дагаварваючыхся Старон.

Артыкул 7.

Правядзенне ў жыццё гэтага дагавора ні ў якой меры не павінна закранаць суверэнных правоў Дагаварваючыхся Старон, у прыватнасці іх дзяржаўнага ўстройства, эканамічнай і соцыяльнай сістэмы, ваенных мерапрыемстваў і, наогул прынцыпа неўмяшання ва ўнутраныя справы.

Месцы прабывання совецкіх наземных і паветраных узброеных сіл (артыкул 4 гэтага дагавора) пры ўсіх акалічнасцях астаюцца састаўной часткай тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі.

Артыкул 8.

Тэрмін дзеяння гэтага дагавора ў частцы, якая датычыць абавязацельстваў узаемнай дапамогі паміж СССР і Літоўскай Рэспублікай (артыкул 2—7) — 15 год, пры чым, калі за год да скангчэння ўказанага тэрміна адна з Дагаварваючыхся старон не прызнае неабходным дэнансіраваць устаноўленых на тэрмін пастаноў гэтага дагавора, гэтыя пастановы аўтаматычна захоўваюць сілу яшчэ на 10 наступных год.

Артыкул 9.

Гэты дагавор уступае ў сілу з абменам актаў аб ратыфікацыі. Абмен актаў будзе праведзен на працягу 6 дзён з дня падпісання гэтага дагавора ў горадзе Каўнас.

Гэты дагавор складзен у 2-х арыгіналах на рускай і літоўскай мовах у горадзе Маскве, 10 кастрычніка 1939 года.

В. Молатаў.
Ю. Урбшыс.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Аб узнагароджані акадэміка Камарова В. Л. ордэнам Леніна.

За выдаючуюся навуковую дзейнасць і ў сувязі з спаўненнем 70-годдзя з дня нараджэння ўзнагарадзіць прэзідэнта Акадэміі Навук СССР акадэміка КАМАРОВА Уладзіміра Леонцьевіча ордэнам Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
КАЛІНІН

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН

Москва, Крэмль. 11 кастрычніка 1939 г.

Растлумачэнне

У Часовыя Упраўленні уездаў і абласцей Заходняй Беларусі звяртаюцца грамадзяне па пытанню аб тым, ці маюць права ўдзельнічаць у выбарах у Народнае Сабранне бежанцы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У сувязі з гэтым Камітэт па арганізацыі выбараў у Народнае Сабранне растлумачвае, што на аснове артыкулаў 2 і 7 „Парадка арганізацыі выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі" бежанцы маюць права ўдзельнічаць у выбарах нараўне з усімі грамадзянамі.

Камітэт па арганізацыі выбараў
у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі

Аб'ява

Камітэт па арганізацыі выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі даводзіць да ведама ўсіх выбаршчыкаў Заходняй Беларусі, што Камітэт знаходзіцца ў горадзе Беластоку ў памяшканні Беластокскага Абласнога Часовага Упраўлення (памяшканне бышага Ваяводства) першы паверх, пакой № 7, тэлефон камутатар Часовага Упраўлення, дабавачны 4; другі паверх, пакой № 15, тэлефон 13-28 і камутатар Часовага Упраўлення дабавачны 23. Устаноўлена дзяжурства членаў Камітэта.

Камітэт па арганізацыі выбараў
у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі

СПІС

выбарчых акруг па выбарах ў Народнае Сабранне Заходняй Беларусі

Дзісненскі ўезд (Глыбокае)

65. **Празароцкая** — цэнтр Празарокі з уваходзячымі грамадамі: Ігнапольская Ульгайская, Янчэўская, Саміцкая, Таржынская, Старынская, Забродская, Юзефоўская, Зарэмбская, Дзізніпольская.

66. **Жабкоўская** з уваходзячымі грамадамі: Дзяткоўская, Чарнявіцкая, Шахновіцкая, Цёмшанская, Свядоўская, Гарыцкая, Кагалеўская, Спішынская.

67. **Птульская** з уваходзячымі грамадамі: Птульская, Ямпольская, Юстынаўская, Шостская, Пераздворская, Чэстаўлянская, Ялоўская, Перкаўлянская, Старасельская.

68. **Ліхабалоцкая** з уваходзячымі грамадамі: Багданаўская, Верхнянская. Валынская, Гератунгская, Хоцькаўская, Шарабойская, Квачэўская, частка Лоўчаўскай і Кавалеўчынскай.

69. **Прыпернянская** з уваходзячымі грамадамі: Зерноўская, Альховіцкая, Лабцэўская, Саковіцкая, Саракоўская, Ковалеўшынская, Жукоўская, Шыпоўская.

70. **Пліокская** з уваходзячымі грамадамі: Удзельская, Сапярыноўская, Юльянаўская, Валожская, (частка Кошталенаўкі), Багданаўская, Петроўская, Озерэцкая, Шубніцкая, Шунеўская.

71. **Міхайлоўская** з уваходзячымі грамадамі: Беразвінаўская, Арэхаўская, Маставіцкая, Жабінская, Гвоздаўская, Абруб Ластавіцкая, Падгайская, (частка Шубніцкай і Азярэцкай).

72. **Новашаркоўшчынская** з уваходзячымі грамадамі: Антонаўская, Балкалоўская, Іванская, Юльянаўская, Каралінаўская, Шаркаўская, Ралзюквецкая.

73. **Шаркавіцкая** з уваходзячымі грамадамі: Красначгорская, Горская, Пальская, Галіноўская, Голоўская, Якубоўская, Лонская, Мікалаеўская, Астраўлянская, Себасцянаўская, Станіславоўская.

74. **Лужская** з уваходзячымі грамадамі: Лужская, Крыўская, Улінаўская, Запольская, Дугаўская, Варонаўская, Лапунаўская.

75. **Парэчанская** з уваходзячымі грамадамі: Ухчынская, Парэчская, Заблоцкая, Васілеўская, Лучайская, Ізабеліцкая, Падорская, Ганчарская.

76. **Порплішчанская** з уваходзячымі грамадамі: Казлянская, Вопганская, Хайлісская, Грабудская, Яцкоўская, Прушынская, Порпліская, Раёўская.

77. **Слабодская** з уваходзячымі грамадамі: Верамейская, Крулеўская, Бабічаўская, Замошанская, Ліпаўская, Слабодская, Грабуцкая.

78. **Германовіцкая** з уваходзячымі грамадамі: Германовіцкая, Саверынаўская, Новасельская, Новапольская, Пашкоўская, Падольская, Чпуніцкоўская, Велянская.

79. **Краснагорская** з уваходзячымі грамадамі: Старадворская, Яноўская, Пальнаўская, Юзэфаўская, Краснагорская, Людвіноўская, Сініцкая, Стоцкая.

80. **Докшыцкая — Докшыцы** з уваходзячымі грамадамі: Лаўты, Палонхі, Блонь, (маёнтак Докшыцы) в. Загараны.

81 **Докшыцкая** з уваходзячымі грамадамі: Крывічане, Янкі Охаўская, Гнездзілава, Касьцюкі, частка Докшыцкай, Лапуцкай, Барсуцкай.

82. **Тумілавіцкая** з уваходзячымі грамадамі: Трасцяніцкая, Рэчныя, Старасельле, Несперайшчына, Валзіна, Туміловічы, Шургуны, Комайск.

83: **Залессе** з уваходзячымі грамадамі: Залеская, Бушаўская, Палавіцкая, Капыльская, Сасноўская, Антанінаўская, Дзмітраўская, Кісароўская.

84. **Узрэцкая** з уваходзячымі грамадамі: Узрэцкая, Загорская, Горэцкая, Новадворская, Рудніцкая, Чэранская.

85. **Мікалаеўская** з уваходзячымі грамадамі: Мікалаеўская, Баранчуцкая, Бондарцы, Вільно, Акунёўская, Касабуцкая, Узгарэліца, Вікольчыкі.

86. **Чарэпаўская** з уваходзячымі грамадамі: Чарэпаўская, Петрыкоўская. Осцерычы, Рунды, Муроўшчына, Голмысель, Стэфанполь, Курсяндзікі.

87. **Жэнужская** з уваходзячымі грамадамі: Жэнужа, Іванкі, Навінкі, Цімашкова, Лемяшкі, Якубіна, Галінава, Верашчакі.

88. **Пліская** з уваходзячымі грамадамі: Пліская, Жнявякі, Севецкая, Асоўская, Суклінская, Савінская, Загорская.

89. **Задарожская** з уваходзячымі грамадамі: Задарожская, Маркоўская, Багушэўская Старынская, Заульская, Барашкоўская, Падвільская, Дуброўшчына, Свільская, Снарская, Варонаўская, Боргоніцкая.

90. **Гаўбіцкая** з уваходзячымі грамадамі: Амбрасовічы, Кормлева, Остраў, Ліпава, Малыя-Давыдкі, Ворнава, Перадольская, Баярская, Кашарская.

91. **Зашчэсленская** з уваходзячымі грамадамі: Зашчэсле, Жаўнераўшчына, Альшына. Ясевічы, Іваноўшчына.

92. **Парафіянаўская** з уваходзячымі грамадамі: Грынеўская, Парафіянаўская, Раніхаўская, Вялікія Сітцы, Старае-Сяло, Вашунава, Веранкі, Заброцы, Баяры, Ручжыполь.

93. **Тэляшынская** з уваходзячымі грамадамі: Анкудава, Бярозаўка, Гнездзілава, Крыпулі, Новыя-Туркі, Патрубок, Селішча, Вароны, Свяркі, Струкі, Дзехтары, Целешы.

94. **Язнечская** з уваходзячымі грамадамі: Язненская, Подлінская, Краснапольская, Ружанпольская, Блошніцкая, Каралеўская, Неміраўская, Пауловіцкая, Кокульская, Сакалоўшчыцкая.

95. **Цветнінская** з уваходзячымі грамадамі: Цветнінская, Чэрахаўская, Чоўнічанская, Чарнапольская, Хатоўшчынская, Катавіцкая, Мысліўская, Прасеўковіцкая, Райпольская, Забалоцкая.

96. **зісненская** — гор. Дзісна.

97. Першая **Глыбоцкая** — гор. Глыбокае.

98. Другая **Глыбоцкая** — гор. Глыбокае.

Старшыня Часовага Упраўлення Віленскай області

ЖЫЛЯНІН

Члены Часовага Упраўлення:

Петроў

Максімцаў

Аніскавец

Прыезд у Маскву ўпаўнаважанага фінляндскага ўрада п. Паасініві

11 кастрычніка г. г. ў Маскву прыбыў упаўнаважаны фінляндскага ўрада п. І. К. Паасініві для перагавораў аб эканамічных і палітычных пытаннях паміж СССР і Фінляндыяй.

Яго суправаджаюць: п. А. Паасонен і п. І. Нюкей.

На Ленінградскім вакзале п. І. К. Паасініві сустракалі: загадчык пратакольнага аддзела Народнага Камісарыята Замежных Спраў В. Н. Баркоў, загадчык аддзела Прыбалтыцкіх краін НКЗС тав. А. П. Васюкоў, састаў фінляндскай місіі на чале з надзвычайным пасланнікам і паўнамоцным міністрам п. Іюс-Коснінам і надзвычайны пасланнік і паўнамоцны міністр Швэцыі п. Вінтэр. (ТАСС).

ТЭЛЕГРАМЫ

Небывалы пад'ём

КАУНАС. 11 кастрычніка (ТАСС). Вестка аб перадачы Вільна і Віленскай вобласці Літве распаўсюдзілася я тут з маланканоснай быстрынёй. Як толькі радыё паведаміла аб заключэнні дагавора паміж СССР і Літвой, Каўнас упрыгожыўся дзяржаўнымі флагамі. У горадзе адчуваецца небывалае святочнае ўзбуджэнне. Людзі сустракаючыся паздраўляюць адзін другога. Радыёстанцыя гор Каўнаса бесперарыўна перадае нацыянальныя маршы і песні.

У 11 гадз. раніцы ўсе установы, прадпрыемствы і магазіны спынілі работу. Рабочыя і служачыя адпускаюцца з работы для ўдзелу ў дэманстрацыі.

У Совецкае Паўпрэдства прыходзяць рабочыя, вучоныя, школьнікі і просяць даць ім фатаграфіі Леніна, Сталіна, Молатава і Варашылава Бесперарыўна па тэлефону літоўскія грамадзяне выказваюць удзячнасць і пачуцце найвялікшай прызнацельнасці Совецкаму народу і яго ўраду.

У 10 гадз. 30 мінут каля будынку Совецкага Паўпрэдства прайшла першая дэманстрацыя, якая вітала апладысментамі і крыкамі „ура" Вялікі Совецкі Саюз

Ад'езд літоўскага міністра замежных спраў п-на І. Урбшыса з Масквы

11 кастрычніка г. г. з Масквы выехаў міністр замежных спраў Літвы п. І. Урбшыс. Разам з ім выехалі намеснік старшыні літоўскага совета міністраў п. К. Бізаўскас, камандуючы арміяй генерал п. С. Рашкіціс, палкоўнік генеральнага штаба п. Рыбшыс, юрысконсульт міністэрства замежных спраў п. Петкевічыус, асабісты сакратар міністра п. Швельнікас, памочнік юрысконсульта п. Крывіцкас.

На беларускім вакзале іх праводзілі: намеснік народнага камісара замспраў тав. С. А. Лазоўскі, намеснік народнага камісара замежнага гандлю т. М. Сцепанаў, намеснік начальніка генеральнага штаба РСЧА камкор. В. Смародзінаў, намеснік старшыні моссавета т. М. А. Яснаў, давераны ў справах СССР у Літве тав. Н. Г. Пазднякоў, торгпрэд СССР у Літве т. С. А. Еханоў, загадчык пратакольным аддзелам Н. К. З. С. (Народны Камісарыят Замежных Спраў) т. В. Н. Баркаў, загадчык аддзелам Прыбалтыцкіх краін Н. К. З. С. т. А. П. Басюкоў, камендант горада Масквы комбрыг т. В. А. Рэвякін, увесь склад літоўскай місіі ў Маскве на чале з надзвычайным пасланнікам і паўнамочным міністрам п. Наткевічыус.

Беларускі вакзал быў упрыгожан совецкімі і літоўскімі флагамі. Быў выстаўлен пачотны караул.

Абед у старшыні Соўнаркома Саюза ССР і народнага камісара замежных спраў тав. В. М. Молатава ў чэсць міністра замежных спраў Літвы п-на Урбшыса

11 кастрычніка с. г. старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Народны Камісар Замежных Спраў т. В. М. Молатаў даў абед у чэсць міністра Зам. Спраў Літвы п-на І. Урбшыса.

На абедзе прысутнічалі: намеснік Старшыні Совета Міністраў Літвы п. Бізаўскас, камандуючы арміяй генерал п. С. Рашкіціс. пасланнік Літвы ў СССР п. Л. Наткевічыус, дырэктар эканамічнага дэпартамента п. І. Норкайціс, саветнік місіі п. Л. Багдонас і п. п. Петкевічыус, Заскевічыус, Рупшыс, Монтвіла, Швельнікас, Чэркелюнас, Вілінас, Крывіцкас, Талат-Келпша, Мейлус.

Апрача ўпамянёных асоб прысутнічалі: т. т. І. В. Сталін, К. Е. Варашылаў, А. І. Мікоян, М. І. Калінін, Л. М. Кагановіч, А. А. Жданаў, Н. А. Булганін, Н. А. Вознесенскі, Н. Г. Кузнецоў, І. В. Смародзінаў, А. Ф. Горкін, В. П. Пронін, В. П. Пацёмкін, В. Г. Дэканозаў, С. А. Лазоўскі, І. Г. Пазднякоў, І. І. Лапшоў, С. П. Гозыраў, С. А. Ехапаў, Р. П. Хмельніцкі, А. А. Собалеў, В. Н. Баркоў, І. Н. Кароткі, Л. М. Куропцеў, А. А. Гемлоў, Б. Г. Понцікаў.

У часе абеда тав. В. М. Молатаў і п. І. Урбшыс абмяняліся павітальнымі прамовамі. Абед прайшоў у цёплай і дружаственнай атмасферы.

Абмен ратыфікацыйнымі граматамі аб пакце ўзаемадапамогі паміж СССР і Латвіяй

РЫГА, 11 кастрычніка (ТАСС). Паверанны ў справах СССР у Латвіі т. Чычаеў і міністар замежных спраў Латвіі п. Мунтэрс, сёння, 11 кастрычніка, у 11 гадзін дня па Рыжскаму часу ў памяшканні міністэрства замежных спраў Латвіі ўтварылі абмен ратыфікацыйнымі граматамі аб пакце ўзаемадапамогі паміж СССР і Латвіяй. Пры абмене ратыфікацыйнымі граматамі прысутнічаў дырэктар дэпартамента дагавораў міністэрства замежных спраў п. Кампе. Пасля абмену граматамі т. Чычаеў і п. Мунтэрс абмяняліся ўзаемнымі паздраўленнямі і выражэннем упэўненасці ў тым, што пакт аб узаемадапамозе яшчэ больш узмоцніць мірныя, добрасуседскія адносіны паміж СССР і Латвіяй.

З моманту абмена граматамі пакт аб узаемадапамозе паміж СССР і Латвіяй у адпаведнасці з артыкулам VI пакта, лічыцца ўступіўшым у сілу.

Утварэнне совецка-германскай цэнтральнай змешанай пагранічнай камісіі

У адпаведнасці з падпісаным 4 кастрычніка г. г. тав. Молатавым В. М. і германскім паслом у Маскве графам фон-дэр-Шуленбургам, дадатковым пратаколам к совецка-германскаму дагавару аб дружбе і граніцы, заключанаму 28 верасня 1939 г., утворана Цэнтральная Змешаная Пагранічная Камісія Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Германіі па дэмаркацыі граніцы паміж дзяржаўнымі інтарэсамі СССР і Германіяй.

Советам Народных Камісараў Саюза СССР ва ўказаную Цэнтральную Змешаную Пагранічную Камісію назначана совецкая дэлегацыя ў саставе: Старшыні — тав. Александрава А. М. ад Народнага Камісарыята Замежных Спраў і членаў: камбрыга Іванова В. Б., маёра тав. Александрава В. П. ад наркамата абароны і палкоўніка т. Леонцьева А. М. ад Пагранічных войск Народнага Камісарыята Унутраных Спраў. 10 кастрычніка 1939 г. Цэнтральная Змешаная Пагранічная Камісія прыступіла к сваёй рабоце ў горадзе Маскве.

(ТАСС)

Літоўскі друк аб совецка-літоўскім дагаворы

КАУНАС. 11. Х. (ТАСС). Усе літоўскія газеты на першых старонках змясцілі тэкст дагавора аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільна і Віленскай області і аб узаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам і Літвой. Газета „Лiетувос Жыніос" змясціла партрэты тт. Сталіна, Молатава і Варашылава. „Ліетувос Аідас" у артыкуле, прысвечаным совецка-літоўскаму дагавору, указвае, што літоўскі народ мае ўсе падставы радавацца, таму што выпраўляецца крыўда, нанесеная Літве польскімі захватчыкамі 19 г. таму назад. „Ад гэтага часу ў літоўскага народа другой думкі ня можа быць, — заяўляе газета, — ад самага пачатку незалежнасці Літвы кіраўнікі СССР падтрымлівалі справядлівыя патрабаванні Літвы. Зараз свет мае магчымасць пераканацца, што Совецкі Саюз добра ўмее ацэньваць мірную палітыку сваіх суседзяў. СССР заўсёды быў вядом, як прыхільнік мірнай палітыкі. У гэтых адносінах Літва вельмі добра разумела палітыку міра, праўдзімую СССР.

Дагавор аб узаемадапамозе паміж Літвой і СССР без сумнення яшчэ больш зближае абедзве дзяржавы. Літва ніколі не адмаўлялась пашыраць свае адносіны з Совецкім Саюзам і нават тады, калі яшчэ не было супольных межаў. Зараз гэтыя адносіны самі сабой і зусім натуральна пачнуць яшчэ больш пашырацца.

Газета „ХХ Амжіус" у перадавым артыкуле піша: „Дагавор аб узаемадапамозе паміж СССР і Літвой яскрава кажа аб абавязках дагаварваючыхся старон. Непахіснасць суверэнітэта Літоўскай дзяржавы яскрава падкрэсліваецца. Артыкулы дагавора ні ў каго не могуць вызваць ні малейшага сумнення. Дваццацігадовая практыка Совецкага Саюза да гэтага часу таксама не дала малейшага поваду сумнявацца адносна лойяльнасці Урада Совецкага Саюза ў выкананні ўзятых на сябе абавязацельств у адносінах да замежных дзяржаў".

Германскі друк аб дагаворы аб перадачы Літве горада Вільна і Віленскай області і аб узаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам і Літвой

БЕРЛІН, 11-га кастрычніка (ТАСС).

Перадаючы падрабязна змест совецка-літоўскага дагавора, „Берлінер Берзенцэйтунг" піша, што перадачай Літве Вільна выканана жаданне літоўскага народа. Два дзесяцігоддзі Літва імкнулася вярнуць сваю сталіцу, але пад даўленнем пагроз панскай Польшчы яна была змушана адмовіцца ад свайго жадання. Літва ніколі не магла забыць, як яна была аграблена панскай Польшчай. „Берлінер Берзенцэйтунг" далей падкрэслівае высказванне „Праўды" аб тым, што Совецкі Урад заўсёды разглядаў Вільна, як тэрыторыю Літвы, і заўсёды меў гэты пункт гледжання.

Заключаны зараз з Літвой дагавор аб узаемадапамозе дае новы доказ паслядоўнасці замежнай палітыкі Совецкаго Саюза. У совецка-літоўскім дагаворы, адзначае газета, можна бачыць цвёрдую гарантыю для безапаснасці Літвы і Совецкага Саюза.

„Дэйчэ Альгемайнэ Цэйтунг" у свой чарод падкрэслівае, што фактам перадачы Літве Вільна Совецкі Саюз паставіў свае адносіны з Літвой на новую базу. Совецкі Саюз палажыў канец насіллю, якое праводзілась панскай Польшчай. „Цяперашняе прылучэнне Вільна да Літвы, — піша газета, — з'яўляецца абсалютна лагічным вынікам совецкай палітыкі ва Усходняй Еўропе".

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Адрас рэдакцыі і друкарні: вул. Епіскапа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.